**Тэма:** М.Янчанка.”Сустрэча з бацькам”; падагульненне па раздзеле “Лёс чалавека на вайне”

**Мэта:** узбагачаць слоўнікавы запас вучняў лексікай твора.

Фарміраваць уяўленні вучняў аб жыцці дзяцей у пасляваенны час, іх сталенне, аб захаванні памяці аб загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны сродкамі мастацкага слова.

Развіваць чытацкія ўменні з дапамогай выбарачнага чытання, знаходзіць адказы на пытанні настаўніка, выказваць свае адносіны да прачытанага.

Развіваць уменне тлумачыць учынкі дзейных асоб, выказваць свае адносіны да іх.

Удасканадльваць уменне фармуляваць тэму твора, разумець у чым заключаеца асноўная думка.

Вучыць падрабязна пераказваць змест апавядання тэксту па складзеным плане.

Падагульніць веды па вывучанаму раздзелу.

**Абсталяванне:** падручнік, крыжаванка, тэст, заданні да раздзела

**Ход урока**

**Арганізацыйны этап**

І так,сябры, увага-
Ужо звінеў званок.
Сядайце,як вам зручна,
Пачнём хутчэй урок.

**Моўная размінка**

Каля шашы да абеліска
Павольным крокам падыду
І пакланюся нізка-нізка,
І моўчкі кветкі пакладу.

М.Пазнякоў

-Прачытаем выразана верш М.Пазнякова .

(Прачытаем хорам, па адным, вучым верш на памяць)

-Якая галоўная думка гэтых радкоў?

-З якім вершам пераклікаюцца гэтыя радкі? Чаму?

**Праверка дамашняга задання**

*(Конкур на лепшага чытальніка верша)*

-Як вы лічыце,чаму П.Броўка не называе імя і прозвішча салдата, які пахаваны каля пераравы?

**Падрыхтоўка да новага матэрыялу**

-На нашай зямлі мноства абеліскаў, якія праслаўляюць подзвіг салдата, загінуўшага на вайне. Часта імя гэтага салдата было невядомым. Нават у

цяперашні час ідуць раскопкі захаванняў,на месцах, дзе ішлі баі, устанаўліваюцца імёны салдат. Многія сем'і не ведалі, дзе пахаваны іх родныя.У многіх загінуўшых салдат засталіся дома дзеці. А як называюць дзяцей, якія засталіся без бацькі?

-Як вы лічыце, якім было жыццё такіх дзяцей-сірот?

-У якім творы вы сустракалі апісанне жыцця дзяўчынкі, якая засталася без бацькоў?

**Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

-Сёння мы пазнаёмімся яшчэ з адным творам пра лёс дзяцей-вайны, а таксама падагульнім веды па раздзеле. Апошні твор нашага раздзела- гэта апавяданне М.Янчанкі "Сустрэча з бацькам". Скажыце, пра што можа расказвацца ў апавяданні з такой назвай?

*(прагназаванне зместу твора вучнямі)*

**Слоўнікавая работа**

*(работа са словамі на ст.91)*

**Першапачатковае чытанне настаўнікам**

**Праверка першаснага ўспрымання твора**

-Якія думкі і пачуцці выклікаў у вас гэты твор?

-Калі і дзе адбываюцца падзеі, апісаныў у творы?

-У чым заключаецца няшчасце галоўнага героя твора?

-Якая тэма апавядання?

**Самастойнае чытанне**

**Дадатковая слоўнікавая работа**

Атуліў

Лучына

Комін

Усхліпы

Мармур

**Работа па сэнсава закончаных частках**

**1 частка**

-Чаму Янку не гулялася, нават пры запаленай лямпе?

-Дзе працаваў тата Янкі?

-Як маці параіла сыну паклікаць бацьку?

**2 частка**

-Як тата, вярнуўшыся з работы, вядзе сябе з сынам?

-Чаму у Міколкі загарэліся вочы, калі ён назіраў за сустрэчай бацькі з Янкам?

-Дзе быў тата Міколкі?

**3 частка**

-Як вы лічыце, чаму Міколка непрыкметна выйшаў з хаты сябра?

-Што засмуціла Міколку дома?
-Куды адпраўляў хлопчык маці?
**4 частка**
-Аб чым падумала маці?
-Што яна назірала, стоячы за дзвярыма?
-Якія гукі даносіліся з коміна?
-Як паводзіла сябе маці, калі ўбегла ў хату?
-Як маці растлумачыла адсутнасць кошыка з бульбай?
-Як Міколка дапамог маці?
**5 частка**
-Хто такі Мікалай Ермакоў?
-Што за асаблівы агонь вячэрняга Мінска клікаў да сябе?
-У гонар каго гарыць Вечны Агонь?
-Якія словы пачуў дарослы Мікалай каля Вечнага агню?
**Аналітычная работа з творам**
-Якую сустрэчу меў на ўвазе аўтар, калі выбіраў назву твора?
-Як вы лічыце, ці было вядома Мікалаю Ермакову месца, дзе пахаваны яго бацька? Чаму?
-Як вы думаеце, хто з хлопцаў раней пасталее? Янка ці Міколка? Чаму?
-Якія рысы характару Міколкі вы мелі магчымасць назіраць у творы?
-Знайдзіце і падцвярдзіце свае адказы словамі з тэксту?
**Падрыхтоўка да падрабязнага пераказу з дапамогай плана**
*(выкарыстоўваецца план ст.94)*
**Вызначэнне галоўнай думкі апавядання**
-Як вы лічыце, што хацеў сказаць М.Янчанка гэтым апавяданнем? Вызначце галоўную думку твора?
**Падагульненне па радзеле “Лёс чалавека на вайне”**
*(даецца 2-3 хвіліны для падрыхтоўкі)*
-Вось мы і закончылі вывучаць наш раздзел “Лёс чалавека на вайне”. Пра што вы даведаліся з твораў гэтага раздзела? А вы ведаеце, што такое палявая пошта?*(настаўнік расказвае)* Нам таксама прыйшлі пісьмы палявой поштай. У іх змешчаны заданні да твораў раздзела, які мы вывучылі. Пачытаем іх і выканаем заданні.*(на стале лісты, складзеныя трохвугольнікам)*
**1 пісьмо**
Раскажыце, як дзеці ў гады Вялікай Айчыннай вайны прымалі ўдзел у барацьбе з фашыстамі. У якіх творах гэта паказана?
**2 пісьмо**
Назавіце твор, з якога вы пачарпнулі наступную інфармацыю:
А) пра жыццё дзяцей у партызанскім атрадзе.

Б) подзвіг юнага партызана Марата Казея.
В) сіроцкае жыццё хлопчыка ў пасляваенныя гады;
Г) захаванне і ўшанаванне памяці аб героях Вялікай Айчыннай вайны.

**3 пісьмо**

Назавіце, з якіх твораў ўзяты ўрыўкі
(заданне 3 ст.95-96)

**4 пісьмо**

Да якога твора зроблены малюнкі? Назавіце аўтара гэтага твора.

**5 пісьмо**

Прыказка: "Герой ніколі не памрэ- ён вечна ў народзе жыве". З якім творам раздзела можна звязаць прыказку?

**6 пісьмо**

"Крыжаванка"

-Калі вы адкажыце на ўсе пытанні крыжаванкі, атрымаеце слова ў жоўтым слупку, дзеля якога змагаліся і гінулі дарослыя і дзеці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, каб мы з вамі жылі мірна.

**Падвядзенне выніку. Тэст**

**Рэфлексія**

-У канцы тэста кожны з вас напішыце некалькі слоў, якія вы б хацелі сказаць тым людзям, якія змагаліся і памiралі за мір на зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

*(пасля таго, як дзеці выканаюць тэст, складзем яго трохвугольнікам,быццам гэта пісьмо з фронта; настаўнік паказвае, дзеці выконваюць арыгамі)*

**Тэст да раздзела “Лёс чалавека на вайне”**

**Варыянт 1**

**1. Пазнач твор, галоўнымі героямі якога з’яўляюцца хлопчык Анатоль і дзяўчынка Ася.**

- ☐ “Сустрэча з бацькам”
- ☐ “Зялёная школа”
- ☐ “Клятва Марата Казея”

**2. Дзе адбылася сустрэча Мікалая Ермака з бацькам?**

- ☐ У партызанскім атрадзе.
- ☐ У доме сябра Янкі.
- ☐ Ля Вечнага агню.

**3. Пазнач твор, у якім паказана складанае жыццё дзяцей у гады вайны.**

- ☐ “Сустрэча з бацькам”
- ☐ “Зялёная школа”
- ☐ “Клятва Марата Казея”

**4. Пазнач творы, да якога мы можам аднесці выраз “і застаўся жывым у вяках”**

- ☐ “Зялёная школа”
- ☐ “А хіба ёсць, што забываюць”
- ☐ “Клятва Марата Казея”

**5. Які з аўтараў яшчэ маладым хлопцам зведаў на ўласных плячах, што такое фашызм. Ваяваў у войску, быў у палоне, пасля пабегу, стаў партызанам.**

- ☐ М.Чарняўскі
- ☐ П.Броўка
- ☐ Я.Брыль

**Словы ўдзячнасці:**

______________________________________________

______________________________________________

**Тэст да раздзела “Лёс чалавека на вайне”**

**Варыянт 2**

**1. Пазнач твор, галоўнымі героямі якога з’яўляюцца хлопчыкі Міколка і Янка.**

- ☐ “Сустрэча з бацькам”
- ☐ “Зялёная школа”
- ☐ “Клятва Марата Казея”

**2. Дзе знаходзіцца абеліск салдату, які апісаў у сваім вершы П.Броўка?**

- ☐ У Мінску на плошчы.
- ☐ У вёсцы, дзе жыў М.Казей.
- ☐ Каля маленькае ракі.

**3. Пазнач твор, у якім паказана пасляваеннае жыццё дзяцей.**

- ☐ “Сустрэча з бацькам”
- ☐ “Зялёная школа”
- ☐ “Клятва Марата Казея”

**4. Пазнач творы, да якога мы можам аднесці выраз “і застаўся жывым у вяках”**

- ☐ “Зялёная школа”
- ☐ “А хіба ёсць, што забываюць”
- ☐ “Клятва Марата Казея”

**5. Які з аўтараў яшчэ маладым хлопцам зведаў на ўласных плячах, што такое фашызм. Ваяваў у войску, быў у палоне, пасля пабегу, стаў партызанам.**

- ☐ М.Чарняўскі
- ☐ П.Броўка
- ☐ Я.Брыль

**Словы ўдзячнасці:**

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________